*Гоўзіч І.М.*
***БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА. XI КЛАС***



## ТЭМА 5. МІХАСЬ СТРАЛЬЦОЎ

1. **Падрыхтуйце мультымедыйную прэзентацыю**, прысвечаную жыццёваму і творчаму шляху М. Стральцова.

2. **Напішыце ліст ад імя галоўнага героя** апавядання Міхася Стральцова «Сена на асфальце», у якім Віктар расказвае пра тое, як склаўся яго далейшы лёс (ці ліст ад імя дзядзькі Ігната).

3. **Паспрабуйце параўнаць будову твораў** Міхася Стральцова «Сена на асфальце»і Міхаіла Лермантава «Герой нашага часу». Што агульнае і адрознае ў іх? Свае назіранні падайце ў выглядзе табліцы:

| **Пісьменнік, твор** | **Кампазіцыя** | **Сюжэт і яго асноўныя элементы** | **Пазасюжэтныя элементы** | **Назвы раздзелаў, іх семантыка** |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

4. Стварыце **вусную замалёўку-апісанне** касьбы Дзяцькі Ігната і Віктара ў горадзе.

5. «Вайна наклала глыбокі адбітак на нашу псіхалогію, на наша светаадчуванне, вызначыла ў значнай ступені нашу маральна-філасофскую арыентацыю (вядома, не толькі ў негатыўным, але і ў станоўчым сэнсе, у сэнсе нашай большай жыццестойкасці, больш устойлівага аптымізму) … мы, жывыя сведкі вайны, не маем маральнага права маўчаць», – адзначыў у адказе на пытанні анкеты часопіса «Маладосць» да 30-годдзя з Дня Перамогі Анатоль Вярцінскі, скажа так, як пісаў у сваёй «Першай кнізе» Іван Мележ, як не адзін раз падкрэсліваў у сваіх творах Іван Навуменка. «Не маем маральнага права маўчаць», – гэтыя радкі можна ўзяць эпіграфам да ўсёй паэзіі (і не толькі паэзіі, але і прозы) пасляваеннага пакалення. **Паспрабуйце самастойна падабраць яшчэ некалькі эпіграфаў** да творчасці «філалагічнага пакалення» і творчасці Міхася Стральцова.

6. **Напішыце водгук** на любімы твор Міхася Стральцова.

7. **Складзіце анталогію** з лепшых, на вашу думку, паэтычных твораў М. Стральцова.

8. **Падрыхтуйце рэферат** на адну з прапанаваных тэм: «Горад і Вёска як вобразы-сімвалы ў сучаснай беларускай прозе»; «Тэма дзяцінства

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ў творчасці М. Стральцова»; «М. Стральцоў – даследчык беларускай літаратуры»; «Час і людзі ў паэзіі Міхася Стральцова».

9. **Паспрабуйце напісаць эсэ на літаратурную тэму.**

**Памятка-парада для падрыхтоўкі і напісання эсэ**

1. Эсэ перадае індывідуальнае бачанне і ацэнку, расказвае аб нечым праз уласнае "я".
2. Эсэ можа ўтрымліваць як апісанне з'яў, падзей, так і разважанні аўтара, яго роздум.
3. Эсэ мае свабодную кампазіцыю, успрымаецца як плынь свядомасці, думак.
4. Эсэ пішацца вобразнай, арыентаванай на размоўную мовай.
5. Эсэ мае невялікі аб'ём.

**Віды эсэ па жанрава-стылістычнай форме**

- эсэ-нататка
- эсэ-мастацкая замалёўка
- эсэ-партрэт
- эсэ-біяграфія (аўтабіяграфія)
- эсэ-ўспамін
- эсэ-дзённікавы запіс
- эсэ-водгук

**Асноўныя патрабаванні да эсэ**

1. Канкрэтная тэма.
2. Навукова-канкрэтная аснова.
3. Падкрэсленая суб'ектыўнасць выказвання.
4. Арыентаванасць на жывую гутарковую мову.
5. Права на дадумванне, фантазію, вымысел.
6. Свабодная кампазіцыя.
7. Камунікатыўнасць, адрасаванасць чытачу.
8. Праблемнасць.
9. Арыентацыя на мэту.

10. **Дапамажыце кветцы аднавіць пялёсткі, у якіх пазначаюцца назвы твораў Міхася Стральцова:**




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ